# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ГАДЗІНА “І ВЕДАЦЬ, І ПОМНІЦЬ” ДЛЯ ВУЧНЯЎ ІХ КЛАСА

С.Р.Тарнаповіч,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце,
настаўнік гісторыі кваліфікацыйнай катэгорыі
“настаўнік-метадыст”
Дзяржаўнай установы адукацыі “Лядзецкая сярэдняя школа”
Столінскага раёна Брэсцкай вобласці

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў гістарычнай памяці і ўсведамлення гістарычнай праўды аб фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, развіццё патрыятычных пачуццяў і адказнасці за будучыню сваёй Бацькаўшчыны.

**Задачы:**

1. Садзейнічаць паглыбленню ведаў вучняў ІХ класа па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ўсведамленню ролі Вялікай Перамогі ў захаванні беларускага народа як самастойнай і незалежнай нацыі.

2. Развіваць і ўдасканальваць уменні вучняў працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, аналізаваць і адбіраць неабходны матэрыял.

**Форма правядзення:** інфармацыйная гадзіна па ўзору тэлеперадачы “Як гэта было”.

**Месца правядзення:** у рэкрэацыі ўстановы адукацыі каля экспазіцыі, прысвечанай генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны “Памяць пра вас назаўсёды, як неўміручая наша зямля і як вечнае яркае сонца над ёю” (мерапрыемства можа быць праведзена у актавай зале, бібліятэцы, у кабінеце гісторыі установы адукацыі).

**Удзельнікі:** вучні ІХ класа.

**Працягласць:** да 60 хвілін.

**Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне:** ноутбук, мультымедыйны праектар, відэаматэрыялы, інфармацыйны матэрыял стэнда “Генацыд беларускага народа”, экспазіцыя, прысвечаная генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны “Памяць пра вас назаўсёды, як неўміручая наша зямля і як вечнае яркае сонца над ёю”, карта “Найбольш буйныя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі”.

**Папярэдняя работа:** сумесны пошук вучнямі ІХ класа і настаўнікам інфармацыі аб фактах генацыду беларускага народа ў час акупацыі тэрыторыі Беларусі ў сетцы Інтэрнэт, гістарычных дакументах, дакументальнай кінахроніцы, краязнаўчым матэрыяле.

**Ход інфармацыйнай гадзіны**

**Уступнае слова настаўніка:**

Добры дзень, паважаныя вучні. Наша інфармацыйная гадзіна пройдзе ў форме тэлеперадачы “Як гэта было”. Яе тэма “І ведаць, і помніць” прысвечана

гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і цесна звязана з бяспрэчнымі фактамі генацыду беларускага народа ў яе перыяд.

Зараз я вам прапаную праглядзець 3-хвілінны фрагмент выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі падчас цэрымоніі ўскладання кветак да манумента Перамогі з нагоды 77-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Абапіраючыся на інфармацыю, якую вы рыхтавалі да мерапрыемства, і выступленне Прэзідэнта нашай краіны, мы паспрабуем знайсці адказ на пытанне: “Ад чаго ўратавала і што прынесла Вялікая Перамога беларускаму народу?”, і падцвердзіць гэта канкрэтнымі фактамі.

*(Вучні праглядаюць фрагмент выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі)*

***Вядучы***

Мінула больш за 77 гадоў з таго часу як капітулявала фашысцкая Германія. Амаль не засталося ўдзельнікаў той вайны. Састарэлі апошнія яе сведкі – дзеці вайны. Аднак нам, маладому пакаленню, патрэбна помніць, якую цану заплаціў наш народ за Перамогу над фашызмам. Вайна ўварвалася ў кожную хату, у кожную сям’ю, кожнаму яна прынесла гора і страты. Давайце высветлім, як гэта было?

Цяжкія выпрабаванні выпалі на лёс дзяцей Брэсцкай крэпасці.

***Вучань 1***

Дзяцінства – самы прыгожы час у жыцці чалавека. Блакітнае неба над галавою. Побач мама і тата. Самае лепшае, самае добрае прыходзіць да чалавека ў дзяцінстве. Але было пакаленне, для якога напамін аб дзяцінстве звязаны з невыносным болем, жахам, адчаем. На долю гэтых дзяцей выпалі вельмі цяжкія выпрабаванні. Іх надзеі на шчаслівае дзяцінства не спраўдзіліся, таленты так і не расквітнелі. Замест школьных парт яны бачылі смерць, разбурэнні, пакуты родных і блізкіх людзей.

Юныя абаронцы Брэсцкай крэпасці. Рыхтуючыся да інфармацыйнай гадзіны, я высветліў, што ў яе абароне разам з дарослымі змагаліся і нашы равеснікі. Кожную ноч пад варожым агнём прабіраліся яны да Мухаўца і прыносілі ваду, аказвалі дапамогу параненым, змагаліся са зброяй у руках. Іх імёны не забытыя і сёння. Гэта Пеця Васільеў, Валя Зенкіна, Валодзя Казьмін, Пеця Клыпа, Коля Новікаў і іншыя.

  

*Фот. 1.* Пеця Клыпа *Фот. 2.* Коля Новікаў *Фот. 3.* Валя Зенкіна

Імёны герояў сталі вядомы дзякуючы пісьменніку і гісторыку С.С.Смірнову, аўтару кнігі “Брэсцкая крэпасць”. Сярод тых, каго знайшоў і пра каго напісаў С.С.Смірноў быў і Пеця Клыпа, адзін з першых юных герояў Вялікай Айчыннай вайны. Пеця нарадзіўся ў Бранску ў сям’і чыгуначніка. Ён рана страціў бацькоў, і на выхаванне хлопчыка забраў да сябе старэйшы брат Мікалай Клыпа, афіцэр Чырвонай Арміі. У 11 гадоў Пеця стаў выхаванцам музычнага ўзвода 333-га стралковага палка. Камандаваў узводам яго брат. У 1939 годзе полк удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, пасля чаго месцам яго дыслакацыі стала Брэсцкая крэпасць. Пеця марыў аб кар’еры ваеннага.

22 чэрвеня 1941 года Пеця з Колям Новікавым планавалі адправіцца на рыбалку. Аднак гэтым планам не суджана было збыцца. Разбудзіў Пецю грукат выбухаў. Казарма рушылася пад агнём праціўніка, вакол ляжалі параненыя і забітыя салдаты. Нягледзячы на кантузію, падлетак схапіў вінтоўку і разам з іншымі байцамі рыхтаваўся сустрэць ворага. У другіх абставінах Пецю, як і іншых выхаванцаў часці, якія знаходзіліся ў крэпасці, эвакуіравалі б у тыл. Але крэпасць уступіла ў бой, і Пеця Клыпа стаў паўнапраўным удзельнікам яе абароны. Яму даручалі тое, з чым мог справіцца толькі ён – маленькі, вёрткі, шустры, менш прыкметны для ворагаў. Ён хадзіў у разведку, быў сувязным паміж рознымі падраздзяленнямі абаронцаў крэпасці. На другі дзень Пеця з Колям Новікавым знайшлі цудам уцалелы склад боепрыпасаў і далажылі аб ім камандзіру. Гэта было каштоўнай знаходкай – у салдат заканчваліся патроны, а выяўлены склад дазволіў працягнуць барацьбу. Байцы спрабавалі берагчы адважнага хлопца, але ён рваўся ў самае пекла, удзельнічаў у штыкавых атаках. Часам Пеця рабіў немагчымае. Калі скончыліся бінты для параненых, ён знайшоў у руінах разбіты склад медыцынскай санчасці і здолеў выцягнуць перавязачныя сродкі і даставіць іх медыкам.

Коля Новікаў здабываў ваду, удзельнічаў у разведвальных аперацыях, падносіў прадукты харчавання і дастаўляў боепрыпасы. У адной з атак замяніў кулямётчыка і прымусіў ворага адступіць. Быў смяротна паранены ў баі, памёр

ва ўзросце 17 гадоў. Пасля смерці яго ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Яго астанкі пакояцца ў Некропалі мемарыяла.

Дзяўчынка-санітарка, герой Брэсцкай крэпасці – гэта пра Валю Зенкіну. У маі 1941 года ёй споўнілася 14 гадоў, а ў чэрвені пачалася вайна. Валя стала адной з тых, хто першым адчуў на сабе жахі вайны. Дзяўчынка да апошняга ўдзельнічала ў абароне Брэсцкай крэпасці і сышла адтуль у палон толькі па рашэнні камандавання.

З успамінаў Валі Зенкінай:

*“...Захопнікі паведамілі жанчынам, дзецям і параненым байцам, што будуць расстрэльваць па 15 чалавек, калі салдаты працягнуць трымаць абарону. На маіх вачах пачалі біць ботамі аднаго нашага параненага чорнавалосага байца і крычаць на яго, што ён яўрэй. Мне стала вельмі шкада гэтага чалавека, я ўчапілася ў фашыста і пачала яго адцягваць. "Гэта грузін, гэта грузін", - адно толькі слова паўтарала я. Мяне паклікаў афіцэр і на рускай мове загадаў ісці ў крэпасць і перадаць нашаму камандаванню, каб гарнізон здаўся ў палон. Я хацела, каб са мной пайшла мама, але яе не пусцілі.*

*– Маці застанецца тут. Ты павінна вярнуцца сюды і перадаць нам адказ савецкага камандавання.*

*...Крэпасць гарэла, вакол было ціха, уся плошча ўсеяна забітымі. Мне стала страшна. Раптам з касцёла загаварыў кулямёт. "Ёсць яшчэ жывыя", - павесялела я і кінулася бегчы насустрач стрэлам".*

*Васьмікласніца апынулася сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Яна адмовілася вяртацца і стала даглядаць параненых разам з іншымі жанчынамі.*

*– Усе палюбілі дзяўчынку і аберагалі, як маглі. І не было сярод нас чалавека, які б не дзяліўся апошнім кавалачкам салдацкага цукру з Валяй – нашай маленькай санітаркай, – успамінаў пазней удзельнік абароны Сяргей Бабронак.*

За свой подзвіг Валя была ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.

***Вядучы***

Першым крокам акупантаў на захопленай тэрыторыі стала ўвядзенне абмежаванняў грамадзянскіх свабод мясцовага насельніцтва. Было абвешчана надзвычайнае становішча уводзіўся абавязковы ўлік насельніцтва і прапускны рэжым. І адразу ж пачаліся масавыя забойствы камуністаў, камсамольцаў, актывістаў савецкай улады. Была створана сістэма турмаў і канцэнтрацыйных лагераў. Згодна плану “Ост” пачала праводзіцца палітыка генацыду і рабавання беларускага народа. Нечалавечыя выпрабаванні і пакуты перажылі мірныя жыхары, людзі яўрэйскай нацыянальнасці, ваеннапалонныя і дзеці. Як жа гэта было?

***Вучань 2***

Звярніце ўвагу на карту *(вучань дэманструе класу карту “Найбольш буйныя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі” з інтэрактыўнымі спасылкамі).* Тэрыторыя Беларусі была пакрыта густой сеткай “машын

смерці", так многія называлі канцэнтрацыйныя лагеры, якіх на нашай зямлі дзейнічала больш за 260. Акрамя гэтага існавалі гета – спецыяльныя кварталы для пражывання і знішчэння яўрэйскага насельніцтва.



*Канцэнтрацыйны лагер “Трасцянец”. Гістарычная даведка (пераходзячы па спасылцы вучань коратка паведамляе аб зверствах фашыстаў і колькасці знішчаных):*

*Лагер смерці “Трасцянец” знаходзіўся ў раёне вёсак Малы Трасцянец і Вялікі Трасцянец Мінскага раёна (у сённяшні час гэта месца знаходзіцца ў раёне Партызанскага праспекта г. Мінска). Лагер смерці “Трасцянец”з’яўляўся самым буйным на ўсёй акупіраванай савецкай тэрыторыі. Па колькасці знішчаных людзей 546 000 чалавек – лагер смерці «Трасцянец» стаіць у адным радзе з другімі месцамі масавага знішчэння ў Еўропе: Аўшвіц, Трэблінка, Сабібор, Белжэц, Майданэк (усе на тэрыторыі Польшы) і Ясенавац (Харватыя). Назва “Трасцянец” аб’ядноўвае некалькі месцаў масавага знішчэння людзей. Ва ўрочышчы Благаўшчына, на 11-м кіламетры Магілёўскай шашы, да восені 1943 года праводзіліся масавыя растрэлы. Сам лагер знаходзіўся побач з вёскай Малы Трасцянец, у 10 кіламетрах ад Мінска. Ва ўрочышчы Шашкоўка з восені 1943 года дзейнічала крэмацыйная яма-печ для спалення трупаў. Попел з крэмацыйнай печы раскідваўся ў якасці ўгнаення на палях размешчанай у раёне лагера дапаможнай гаспадаркі, якая належала ўпраўленню паліцыі бяспекі і службы бяспекі СД.*

***Канцэнтрацыйны лагер смерці “Азарычы”.***

*Пераходзячы па спасылцы, размешчанай на інтэрактыўнай карце, вучань прапануе увазе аднакласнікаў праект газеты “7 дзён” – карта памяці “Лагер смерці Азарычы: 10 дзён, якія ўскалыхнулі ўсіх”.*

***Вядучы***

Ім не спявалі маткі калыханкі,
Яны не чулі казак ад дзядоў,
Палохаў іх ахрыплы голас танкаў,
Трывожыў іх журботны енк удоў.
Яны не плакалі бяссоннымі начамі,
Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.
І словы першыя, якім іх навучалі,
Былі пра немцаў, пра вайну і хлеб.

П.Панчанка. “Дзеці вайны”

Дзеці вайны. На іх лёс выпалі не дзіцячыя выпрабаванні. Дзеці і вайна – несумяшчальныя паняцці. А растрэл дзяцей не ўкладваецца ў розум разважных людзей, растрэл толькі за тое, што яны былі беларусы, рускія, украінцы, яўрэі. Трагічны лёс быў наканаваны выхаванцам дзіцячага дома з Дамачава.

***Вучаніца 3***

Дамачаўскі дом-інтэрнат быў адкрыты ў 1925 годзе польскімі ўладамі. У ім выхоўваліся сіраты: дзеці палякаў, беларусаў, рускіх, украінцаў. У 1941 годзе там знаходзілася сто дзяцей рознага ўзросту: ад грудных да 12-гадовых. У большасці з іх не было ні бацькоў, ні сваякоў. У першы дзень вайны ў выніку бамбёжкі загінулі трое дзяцей, яшчэ двое было паранена. Адзін будынак згарэў, і дзеці былі размешчаны ў двух уцалелых. Яны спалі па чатыры чалавекі на адным ложку, паміралі ад захворванняў і знясілення.

Немцы забіралі дзяцей, гналі іх у бальніцу, бралі ў іх кроў. Потым адводзілі ў хлеў, падлога якога была выслана драўлянай стружкай. Змучаныя дзеці падоўгу знаходзіліся там. Тых, хто паміраў ад страты крыві, закопвалі каля хлява. Выжыўшыя дзеці самі дабіраліся да дзіцячага дома. Праз год здарылася самае страшнае, усіх дзяцей разам з выхавальніцай Палінай Грахольскай расстралялі.

Пасля вызвалення Дамачава, відавочцамі трагедыі (Лізавета Грачова, Антаніна Паўлюк, Анастасія Усава і інш.) у жніўні 1944 года быў складзены акт аб расстрэле дзяцей. На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі ваеннымі злачынцамі фашысцкай Германіі фігурыраваў акт растрэлу дзяцей Дамачаўскага дзіцячага дому. Дарэчы, некаторыя відавочцы ў якасці сведак прысутнічалі на Нюрнбергскім працэсе.

**З акту жыхароў г.п. Дамачава аб растрэле дзяцей:**

“23 верасня 1942 года каля сямі гадзін вечара ў двор дзіцячага дома прыехала аўтамашына з шасцю ўзброеннымі немцамі ў вайсковай форме. Старэйшы з групы немцаў Макс растлумачыў, што дзяцей павязуць у Брэст, і загадаў садзіць іх у кузаў аўтамашыны. У машыну было пасаджана 55 дзяцей і выхавальніца Паліна Грахольская. Шахметава Тося, дзевяці гадоў, злезла з машыны і ўцякла, а ўсе астатнія 54 дзіцяці і выхавальніца былі вывезены ў напрамку станцыі Дубіца, за паўтара кіламетры ад вёскі Ляплеўка. На пагранічнай агнявой кропцы, размешчанай на адлегласці 800 метраў ад ракі Заходні Буг, аўтамашына спынілася, дзеці былі распранутыя, пра што сведчыць наяўнасць дзіцячай бялізны ў машыне, якая вярнулася ў Дамачава. Дзеці і іх выхавальніца былі расстраляныя...”.





*Фот. 4-5.* Манумент “Пратэст”

У памяць аб загінуўшых у 1952 годзе на ўскраіне Ляплеўкі быў усталяваны абеліск. У 1987 годзе на гэтым месцы ўсталяваны помнік "Пратэст", які ўяўляе сабой стэлу з белага мармуру вышынёй 8 метраў, да якой прымацаваныя бронзавыя фігуры дзяцей, якія заклікаюць аб дапамозе. Архітэктары праекта: М.Ткачук і Г. Пашкоў, скульптар А. Салятыцкі.

*(Вучаніца прапаноўвае аднакласнікам праглядзець відэа "Гадавіна трагедыі", якое дае магчымасць больш падрабязна пазнаёміцца з выпрабаваннямі, выпаўшымі на лёс дзяцей з Дамачаўскага дома-інтэрната).*

*https://www.youtube.com/watch?v=y_VyjEiJMHc*

***Вядучы***

Ад асэнсавання зверства фашыстаў, сэрца болем стогне – гэта пра "дзіцячую Хатынь" – донарскі канцэнтрацыйны лагер "Чырвоны бераг". Што гэта за лагер, якія зверствы над дзецьмі чынілі акупанты, і як гэта ўсё было?

***Вучань 4***

Інфармацыя пра нечалавечыя выпрабаванні маленькіх беларусаў у лагеры не аставіць абыякавым і раўнадушным ні аднаго чалавека, незалежна ад яго нацыянальнасці.

…Фашысты занялі Чырвоны бераг 5 ліпеня 1941 года. У вёсцы яны стварылі буйны перасыльны пункт. Тут жа, у панскай сядзібе, размяшчаўся ваенны шпіталь, які меў патрэбу ў вялікай колькасці донарскай крыві. У 1943 годзе на тэрыторыі мясцовай вучэбнай гаспадаркі гітлераўцы арганізавалі донарскі дзіцячы лагер, праз які прайшло каля 15 тысяч чалавек, у тым ліку 12 тысяч дзяцей з розных куткоў Беларусі і СССР. У асноўным гэта былі дзяўчынкі 8-14 гадоў з першай групай крыві і станоўчым рэзус-фактарам. Частка дзяцей пасля медыцынскага абследавання адпраўлялася ў Германію ў якасці донараў для параненых. Вядома, што такім чынам было адпраўлена каля 2 тысяч дзяцей Рагачоўскага, Добрушскага і Жлобінскага раёнаў.

У 2004 годзе на месцы былога канцлагера быў адкрыты мемарыяльны комплекс. Яго распрацаваў беларускі архітэктар Леанід Левін.

Комплекс, прысвечаны ахвярам фашызму ў Чырвоным Беразе, уяўляе сабой плошчу Сонца з васьмю разыходзячыміся па яблыневым садзе алеямі-прамянямі. Асноўнымі аб'ектамі мемарыяла з'яўляюцца: скульптура дзяўчынкі, "Белы клас", пісьмо Каці Сусанінай, караблік Надзеі, дзіцячыя малюнкі і яблыневы сад.

Фізічнае знішчэнне дзяцей – гэта жудасныя факты генацыду беларускага народа.



*Фот.6.* Мемарыяльны комплекс “Чырвоны Бераг”

***Вядучы***

І на Століншчыне нямецка-фашысцкія акупантыаставілі свае крывавыя сляды. Месцам незагойнага болю, смутку і памяці для кожнага жыхара нашага раёна застанецца трагедыя ва ўрочышчы Стасіна. Даведаемся, як гэта было.

***Вучаніца 5***

12 ліпеня 1941 года Столін быў захоплены войскамі вермахта. Акупацыя працягвалася 3 гады – да 7 ліпеня 1944 года.

Ранняй вясной 1942 года немцы, рэалізуючы гітлераўскую праграму знішчэння яўрэяў, стварылі гета і сагналі ў яго ўсіх яўрэяў Століна, а таксама яўрэйскіх жанчын і дзяцей з бліжэйшых вёсак.

Поўнае знішчэнне Столінскага гета адбылося 11-12 верасня 1942 года. Магілай стаў велізарны катлаван памерам 300 на 100 метраў і глыбінёй да 10 метраў, які быў выкапаны яшчэ да вайны савецкімі зняволенымі пад падземныя ангары для сакрэтнага аэрадрома. Перад катлаванам напаўжывым людзям загадалі цалкам распрануцца і па-асобнасці скласці вопратку і абутак. Потым яўрэяў спускалі ў яму, прымушалі легчы радамі галавой уніз, і салдаты СС хадзілі па целах і забівалі іх з аўтаматаў. Такім зверскім спосабам былі забітыя ўсе вязні Столінскага гета.

Па архіўным звесткам ва ўрочышчы Стасіна, з вясны 1942 года па ліпень 1944 года, было растраляна 12500 чалавек, з якіх 8000 яўрэяў. Сярод забітых 5332 мужчыны, 3620 жанчын і 3548 дзяцей.




*Фот.7.* Мемарыял на месцы масавага пахавання ахвяр фашызму ва ўрочышчы "Стасіна". Столінскі раён

На ўваходнай стэле мемарыяла высечаны словы: "Помните! Жертвам – бессмертие, карателям и предавшим память – презрение".

Гэтыя словы – наказ для нас і будучых пакаленняў ні ў якім разе не забываць сваю гісторыю, шанаваць памяць аб тых, хто ваяваў і аб тых, хто стаў ахвярай, але не здрадзіў сваёй Радзіме ў імя міру, жыцця і Перамогі.

**Хвіліна маўчання**

**Заключнае слова настаўніка:**

**Настаўнік:**

Прапаную кожнаму з вас даць кароткі адказ на пытанне, якое прагучала ў пачатку: "Ад чаго ўратавала і што прынесла Вялікая Перамога беларускаму народу?"

*Прыкладныя адказы вучняў*

– Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне ўратавала беларускі народ ад вынішчэння і пераўтварэння ў рабочую сілу для фашысцкай Германіі.

– Вялікая Перамога зберагла самастойную і незалежную беларускую нацыю.

– Поўная рэалізацыя плана "Ост" у дачыненні да беларускага народа прывяла б да яго поўнага фізічнага знішчэння.

– Перамога дала магчымасць нарадзіцца ў пасляваенны час мільёнам маленькіх беларусаў, сярод якіх і я са сваімі сябрамі.

– Мой прадзед, прадзеды маіх сяброў і аднакласнікаў дабывалі Вялікую Перамогу на фронце дзеля таго, каб прадоўжыць свой род, каб нарадзіліся новыя пакаленні беларусаў, каб Беларусь была незалежнай і свабоднай.

**Настаўнік:** Інфармацыйная гадзіна падыходзіць да заканчэння. Факты генацыду беларускага народа, якія мы сёння агучылі, знайшлі водгук у вашых сэрцах, закранулі вашу душу, прывялі да асэнсавання значнасці Вялікай Перамогі для існавання беларускага народа і незалежнай беларускай дзяржавы, важнасці міру на ўсёй зямлі. Спадзяюся, што вашы справы і ўчынкі будуць скіраваны на мір і стварэнне, як даніна памяці аб тых, хто даў нам магчымасць жыць.

**Падвядзенне вынікаў, рэфлексія.**

*Вучням прапануецца скласці водгук на інфармацыйную гадзіну ў форме калажа або воблака слоў.*




Малюнак 1. Воблака слоў

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Брестская крепость. Режим доступа://https://www.hata.by/articles/brestskaya_krepost-9108/ – Дата доступа: 01.11.2022.
2. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : справочник /авт.-сост. А.А.Коваленя, М.А.Краснова, В.И.Лемешонок. – Минск: Изд.центр БГУ, 2007. – 235 с.
3. Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы /Генеральная прокуратура Республики Беларусь под общей редакцией А.И.Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – 122 с.
4. Памяць. Хроніка Столінскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.217-244.
5. Смирнов, С.С. Брестская крепость [Электронный ресурс]: С.С.Смирнов. – Москва, 2000 Режим доступа://https://www.booksite.ru/fulltext/0/001/003/118/001.htm – Дата доступа: 01.11.2022.